Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі приймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VIII. 10 студня 1913 г. №. 2.

## 3х месячные
## курсы для кантралероў пры малочнай гаспадарцы

устраівае Віленскае Сельска-Гаспадарскае Таварыство у дварэ Кена ягомосці п. Славінскаго (Ст. Кена Л. Р. ж. д.).

**Пачатка 16 студня 1913 г.**

Плата за навуку разам с харчамі 75 рублёў.

*Просьбы* аб прыняцці на курсы трэба падаваць у С.-Г. Таварыство (Вільня, Завальня 9) *да 15 студня г. году*, там-жэ можна падробна даведацца аб курсах.

## Што трэба рабіць?

Сем гадоў працуе «Наша Ніва», каб папхнуць беларусоў да ўсестароннаго адраджэньня. Сем гадоў яна стараецца асьвяціць тые сьцежкі, каторые вядуць наш народ да новаго жыцьця. Пазнаньне краю і практыка—вось асновы нашай работы. Апіраючыся на тое «Наша Ніва» поруч з сваімі супрацоўнікамі намеціла кароткую праграму працы, да каторай кожын беларус, кожын праўдзівы сын сваей Бацькоўшчыны павінен прылажыць руку: для кожнаго знайдзецца тут нешта такое, што яму будзе пад сілу.

Работа наша павіннаісьці главным чынам да пашырэньня прасьветы і развіцьця грамадзянскай і нацыональнай сьвядомасьці у беларусоў, а поруч з гэтым развіваць экономічную сілу народу. Дзеля першай мэты трэба рабіць вось што:

1) завадзіць школы, бібліотэкі, чытальні, рабіць лекціі, організовываць курсы для народу і т. п. ды ўсюды праводзіць у жыцьцё думку аб націоналізаціі прасьветы як школьнай, так і за межамі школы.

2) шырыць друкаванае слова — кніжкі, газэты, брошуры—ў беларускай мове; прыкладываць сваю руку да іх выданьня.

3) аткрываць уселякіе кружкі і таварыствы, дзе можна было-бы шырыць грамадзянскую і національную сьвядомасць.

4) працаваць дзеля развіцьця беларускай літэратуры, штукарства, тэатру і музыкі (песьні).

5) знаёміць шырокіе кругі з нашай мінуўшчынай, цяперашнім палажэньнем народу і яго задачамі ў будучым; арганізаваць выстаўкі і музэі эгнографічные, гісторычные, кустарные і т. п.

Дзеля гэтаго, каб узрастала экономічная сіла народу, трэба развіваць усе яго творчэскіе сілы і рупіцца аб тое, каб здабыць усе патрэбные варункі. На гэтым грунці работу трэба васьці гэтак:

1) развіваць у народзі прывычку здаволіваць свае патрэбы сваімі сіламі—супольнай, хаўруснай працай.

2) памагаць умацаваньню і развіцьцю селянскай гаспадаркі, пашырэньню селянскай зямельнай ўласнасьці; аткрываць таварыствы дзеля парцэляціі зямлі між беларусамі і бараніцца ад наплыву чужынцоў.

3) аткрываць уселякіе хаўрусы і суполкі—крэдытные,гандлёвые, дзеля супольнай працы над вырабам разных тавароў і т. п.

4) організаваць сельска-гаспадарскіе хаўрусы, школы, выстаўкі і інш.

5) завадзіць організаціі дзеля падмогі коопэраціі, развіцьцю гаспадаркі, хатняго рэмесла і т. д.

6) рупіцца аб палепшэньні варункоў працы.

7) памагчы упарадкаваць справы эміграціі; старацца заместа эміграціі у Амэрыку арганізаваць эміграцію на сэзонные работы у бліжэйшые краі (на лета), каб людзі верталіся да хаты з грашыма і з навукай сельскай гаспадаркі павэдлуг практыкі ў чужых старонах.

Кожын крок на гэтай дарозі будзе набліжаць нам той момэнт, калі народ, пазнаўшы свае патрэбы і навучыўшыся сваімі сіламі здаволіваць іх, наканец-такі *возьме усе свае справы у свае рукі.*

а—н—а.

## Вайна.

Прэдстаўнікі ваюючых держаў усё ешчэ угаварываюцца аб згодзе і гэтые угаворы ніяк не наладжываюцца. У газэтах друкуюцца тэлеграмы раз, што хутка пачнецца ізноў вайна, другі раз, што наступіць згода. Балканскіе гасударствы хочуць прымусіць Турцію рабіць згоду на сваіх варунках, гэта значэ, каб усе землі, каторые дагэтуль забралі хаўрусьнікі асталіся ім, а Турція кажэ, што Чорнагорцы, „бралі" пяць разоў крэпасць Скутары, а Баўгары чатыры разы Адрыанопаль, а абедзьві крэпасці і дагэтуль не здаліся, дык і земля тая ешчэ не заваевана. Згода, як відаць з гэтаго, сама сабой, паміж ваюючымі старонамі не наладзіцца, калі не ўмешаюцца другіе дзержавы. А ўмешаюцца другіе державы, агонь перакінецца далей. І выходзіць, як у тэй загадцы с казой, воўкам і капустай. Гэтымі днямі вялікіе дзержавы паслалі сваю „ноту" Турціі, у каторой гаворыцца, каб Турція уступіла Баўгарам Адрыанополь. Але нет ведама ці Турція на гэта згодзіцца. Баўгары на ўсякі прыпадак рыхтуюцца да таго, каб ізноў пачаць вайну, а Турція, гэтак сама на ўсякі прыпадак, узмацавала чальтжынскую лінію. Пішуць, што форты каля Чальтжы устроены павэдле усіх вымогоў сучаснай ваеннай штукі. Наагул, можна сказаць, што у перэгаворах аб згодзе больш выгледае на пачатак новай вайны, чым на згоду.

## Сьвяточные гутаркі.

Мінае год за годам, і хоць уселякіе паназначаны землеустраіцельные „камісіі наблюдзенія над камісіямі пасграенія", аграномы „даюць указанія", каморнікі лётаюць, як з дудамі, с сваімі прыладамі і т. д., а гаспадарка наша нешта аніяк не пячэцца: Янка пасеяў—Янка з'еў. Ці пад'еў Янка—гэта іншая справа, добра, што хоць еў, але што Янучыха з Янучэнятамі то пэўна з голаду зайшліся б, каб гэты самы Янка не зарабіў на старане і гэткім парадкамі не падкарміў сваей сям'і.

Крычаць, нападаюць на нашаго хлебароба, чаму не бярэцца ён за новы спосаб гаспадарыць, чаму не купляе фабрычных гнаёў, чаму не спраўляе гаспадарскіх машын, чаму не адховывае кабыл, плацячы па 25 рубл. за жэрабка і т. д. і т. д.

Як жэ яму рызыкаваць мо апошніе 25 рублёў, чэкаць з год на жэрабё (ды ешчэ ці будзе яно??), калі есьці сягоньня трэба? Як яму рызыкаваць апошнім запасам на гнаі і машыны, варожачы на ўраджай к налецьцю, калі німа ведама ці здарыцца ешчэ дзе зарабіць рубля, ці не, а тут хатніх расходоў ужо гібель нарасло? Не, сыты-галоднаго ніколі не зразумее!

Калі круціцца, баліць з голаду чэлавеку галава, то якіе прыклады не рабі баіецць яна не перэстане, пакуль не накорміш жывата.

Так сама і для нашых хлебаро-

## Ральля.

Ешчэ сярод гушчароў лежаў закарэлы сьнег, ешчэ сьвежые лужыны лёдам ценкім пакрыліся, але весна жыватворная ужо запанавала над вёскай. Цёпла грэло сонейко і пачалі пукацца маладые бярозкі. У першы раз апасьля доўгай сцюдзёнай зімы, выбраўся малады аратай на свой шнур.

Перэжэгнаўся, ешчэ раз агледзіў новые нарогі і схінуўся над сахой.

Як роўные доўгіе струны ляглі адна за другой чорные барозны... Запахла сьвежай, тлустай чарноземью...

Ральля мяккімі грудкамі сваімі заблішчэла сярод крушнеў, на абшырнай даліне.

Дзе-недзе бялелі сярод ральлі леташніе карэньня траў.

Апусьціліся вароны с старога дуба і пачалі зважны агляд ральлі.

С крыкам прывалюхалі гусі.

Ажыла ральля...

Заківаўся, зашэптаў высокі дуб .. Закалацілося сэцэ аратая, абхапіў ён мазалістымі рукамі сваімі, абсмалены пень на мяжы, і неяк само вырвалося з грудзей яго;

— «Зямелька, матка наша!..»

Ніжэй апусьціўся ён і пацалаваў сьвежую зямлю.

**Змітрок Бядуля.**

А. Тэсленко.

## Што з яго было-б?

Купіў я сабе дзьве кніжэчкі на кірмашы. Такіе харошые: чытаў, чытаў і ешчэ корціць. Па нашаму напісаны і аб нас, мужыках, аб горы ды бядзе нашай,

Добра пісьменнікам: вучоные і жыць, мабыць, ёсць пры чым. Пішуць сабе. А я вось... мала пісьменны, папіхач чужы... А, здаецца, напісаў бы і я нешта такое. Дай спробую, ня што раблю цяпер, нядзелька сягоньня. Толькі,.. хоць і напішу што, то што-ж з гэтаго выйдзе? Будзе ляжаць, пакуль паліція ізноў забярэ. Панапісываў быў артыкульчыкоў, вершыкоў -забралі. Ды-й цяпер староста і вураднік крыва глядзяць на мяне. Дзіўно ім: прасьцюсенькі парабак, жыве у вёсцы, на падзёншчыну ходзіць і ў паперах капаецца? І гэта ізноў пасьля арэшту!

Дзіўно і інтэлігенціі нашай: «пісьменьнік»!— гэтак насьмешліва вымаўляюць тое слова.

Ніхай! Не забярэ паліція — для сябе будзе. Аб чым-жэ тут пачаць? Пачну аб жыцьці сваім! Толькі за сягоньня не сьпішу я яго усяго, а заўтра малаціць, пасьля заўтра так сама. А тут ешчэ нездаровіцца. Ну, ды ніхай! Буду нядзелямі па троху пісаць. Ды... як умею. Ды ешчэ з раздзеламі, як у тых кніжэчках...

I.

Паглядзіш на сьвет Божы—гэткі харошы! Сонейка сьвеціць, красачкі растуць, дрэвы... Гэтак хочэцца жыць, рабіць штось, ляцець кудысь.

Быў я ешчэ невялічкім. Штонікі на мне былі да каленяк, сьвітачка лапленая. Залезу бывала у лазьняк, гэтак мне там добра: кружочкі ад сонейка і тут, і тут, скакунчыкі цьвірыкаюць. На душы гэтак... хочэцца прыпасьці да ўсяго, цэлаваць і ўгледацца і ўгледацца на яго?

Пайду з маткай у цэркву: сьвятые скрозь, харугві, крыжы, бацюшка у рызах, а на клырасі сьпеваюць, — ну й сьвет! Толькі... нашто тое пекла ёсць, страшны суд будзе? Бацюшка бывала, як раскажэ аб гэтым — баюся, баюся. І сьніцца бывала.

У ночы як прысьніцца вось гэтак: земля гарыць, неба валіцца,—баюся, крычу. А мацеры гэтакі неспакой! Турбуецца, бывала, страх:

— Перэпалох... Божэ мой!..

На бацьку жаліцца, бывала.

— Спудзіў дзіцятко, кажэ,—заеў!

А ён неяк... усё сярдзіты... Скажэ яму матка аб чым, а бацька крычыць:

— Алею вун трэба, боцікоў вун хлопцу трэба! Дзе я таго, дый гэтаго набярўся вам! Я вун бяз боцікоў, без алею і вырос!.. У наймітах!

Страшна, страшна мне, што ён якійсь... барада сіваватая, нос гарбаценькі. А тут, як не замаўчыць ешчэ маці, — бьець яе, лаецца. Трасуся.

І гэта сьнілося мне часта; бывала і ўскочу с прасонак.

Бывала бядуе, бядуе матка.

— Што ты будзеш рабіць у сьвеці Божым, гэткае горэ! — Бярэ піражок, колькі медзякоў і вядзе мяне да бабы. Выліваe мне баба перэпалох той. Нейкая смала, вада надамной. А мне усё адзінакава. Сціскала, сціскала раз баба плечыма, дый кажэ да мацеры:

— Паганая хвароба! Гэтаго выліць нельга. Гэта «нячысты» ў сярэдзіне.

Глядзіць матка.

— Ага,—ківае тая галавой,—гэта як у івангельлі, што бацюшка пяець...

Замаркоцілася матка і сама не свая.

— Божухна мой, што-ж рабіць?

Давай мне баба выкурываць «яго». На абмятае па вуглох павучыны, наскрабе трэсачэк с калатовак, с парогоў, с качалкі, с парубня; на-

